# Узорна падрыхтавацца да сесіі— абавязак кожнага студэнта

★ ★ ★ ★

## ПРАЦУЕМ СІСТЭМАТЫЧНА

Студэнты другога курса аддзялення фізікі павінны здаць у зімовую сесію некалькі складаных экзаменаў. Каб паспяхова справіцца з гэтай задачай, большасць студэнтаў цяпер сістэматычна працуе над кнігай.

На семінарскіх і практычных занятках часта выступае Л. Мінкевіч. Яго змястоўныя адказы сведчаць аб тым, што да сесіі ён прыдзе добра падрыхтаваным. Настойлівая вучоба ў яго спалучаецца з грамадскай работай. Л. Мінкевіч актыўна падтрымлівае кожнае мерапрыемства, удзельнічае ў спартыўных спаборніцтвах. Рэгулярна рыхтуюцца да семінарскіх і практычных заняткаў Н. Кандрашоў, П. Балдуеў, І. Яўменава і Н. Сінякова.

Вялікай павагай карыстаецца на курсе А. Пазняк. Ён дапамагае ў вучобе сваім аднакурснікам, растлумачвае ім незразумелыя пытанні. Добры прыклад дае аднакурснікам сакратар комсамольскага бюро курса Л. Бічанкоў. Яго выступленні на семінарскіх занятках дакладныя і прадуманыя. Добрасумленна рыхтуюцца да заняткаў студэнты Н. Цернігор'ева і А. Рудой.

Але яшчэ не ўсе студэнты нашага курса ўсвядомілі важнасць сістэматычнай работы над вучэбным матэрыялам. Пасіўнымі наведвальнікамі семінараў з'яўляюцца. А. Пракапчук і З. Ліўшыц. Наогул, Пракапчук адмежаваўся ад жыцця курса.

Некаторыя студэнты дрэнна вядуць сябе на лекцыях, што перашкаждае астатнім весці канспектаванне. М. Волк-Левановіч рашыла, што калі яна хутка рашае задачы па матэматыцы, то гэта дае ёй права размаўляць на занятках, недысцыплінавана весці сябе. Не адстаюць ад яе і Н. Баканенка, О. Матусевіч, Л. Сарока. А група мала звяртае ўвагі на гэтых парушальнікаў дысцыпліны.

**В. ГАЛУБОВІЧ.**

## ПРАВІЛЬНА РАЗМЯРКОЎВАЮ ЧАС

У зімовую сесію я буду здаваць складаныя экзамены па картаграфіі і геамарфалогіі і працаёмкі залік па фізічнай геаграфіі свету. Таму цяпер я імкнуся мэтазгодна выкарыстоўваць кожную хвіліну.

У нас вельмі напружаны час. Кожны дзень чытаецца па чатыры, а то і па пяць лекцый. Вось чаму я рашыла скласці цвёрды рэжым дня.

Пасля заняткаў я штодзённа з 4 да 8 гадзін вечара працую над кнігай. Большую частку гэтага часу я адводжу на вывучэнне курса фізічнай геаграфіі частак свету, адшукваю на карце назвы тых гор і рэк, аб якіх гаворыцца ў падручніку.

Мне здаецца, што чатырох гадзін самастойнай працы дастаткова.

Астатні час у мяне ідзе на выкананне грамадскіх даручэнняў, на адпачынак. Два разы ў тыдзень я бываю на рэпетыцыях танцавальнага гуртка, а ў сераду еду на аўтазавод, дзе працую агітатарам. У астатнія дні пасля 8 гадзін вечара чытаю мастацкую літаратуру або наведваю кіно. Перад сном пераводжу некалькі старонак тэксту на замежнай мове.

Спадзяюся, што цвёрды рэжым дня дапаможа мне паспяхова закончыць зімовую экзаменацыйную сесію.

**Р. ПАЎЛОВІЧ,**
**студэнтка ІІ-га курса аддзялення геаграфіі.**

## ДАПАМАГАЕ ЎДЗЕЛ У РАБОЦЕ ГУРТКА

Маім любімым прадметам з'яўляецца палітычная эканомія. Пры падрыхтоўцы да семінараў я дэталёва канспектую творы класікаў марксізма-ленінізма, складаю падрабязны план адказу і прадумваю кожнае пытанне. У гэтым мне вельмі дапамагае ўдзел у рабоце навуковага гуртка па палітэканоміі, пасяджэнні якога я наведваю рэгулярна. Цяпер я распрацоўваю тэму «Узмацненне паразітызма і загніванне капіталізма пасля другой сусветнай вайны». На чарговых занятках гуртка гэтая тэма будзе пастаўлена на абмеркаванне.

Я імкнуся размяркоўваць свой час так, каб яго хапала і на падрыхтоўку да семінараў, і на самастойную вучобу, і на адпачынак. Для працы над кнігай я адводжу кожны дзень не менш 5 гадзін. Асаблівую ўвагу звяртаю на грамадзянскае права. Па гэтаму прадмету я чытаю не толькі падручнік, але і дадатковую літаратуру. Гэта мне дазволіць добра падрыхтавацца да экзаменаў.

**Г. ГРАЧОВА,**
**студэнтка ІІ-га курса юрыдычнага факультэта.**

## *КНІГІ ЧЫТАЮЦЦА... НЕКАЛЬКІ ГОД*

**(Пісьмо ў рэдакцыю)**

Часта чытачы выходзяць з універсітэцкай бібліятэкі незадаволенымі. На кніжных паліцах зноў не аказалася патрэбнага падручніка, неабходнага мастацкага твору!

А ў гэты час на дошках аб'яў, на дзвярах бібліятэкі мы знаходзім доўгія спісы студэнтаў, якія па некалькі год не здаюць кніг. Напрыклад, Т. Сарока, студэнтка IV курса аддзялення журналістыкі, 17 снежня 1952 года ўзяла раман Джапарыдзе «Хеўская нявеста» і «чытае» яго да гэтага часу. Два гады ўжо трымае падручнік па псіхалогіі студэнт III курса аддзялення журналістыкі Сяргей Гаварко. Доўга не здае кніг Н. Крэмень (аддзяленне журналістыкі).

Першае месца па запазычанасці кніг займае аддзяленне геалогіі. Доўгі спіс тут узначальваюць Т. Махнач, Р. Шэмпель, Л. Цяўлоўская.

Звыш года студэнт Г. Гурыновіч «вывучае» змест пяці падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, якія вельмі патрэбны і іншым студэнтам. Не адстаюць ад яго студэнты хімічнага факультэта В. Бароўская, Л. Власёнак і А. Эрдман.

Хіба нельга бібліятэцы знайсці больш дзейсныя спосабы ўздзеяння, чым вывешванне спісаў студэнтаў, якія не ліквідавалі запазычанасці? Можна і патрэбна.

**М. АДАМАЎ.**

ФІЗКУЛЬТУРА І СПОРТ

# ПЕРАМОГА НАШЫХ ЛЁГКААТЛЕТАЎ

У нядзелю ў хімічным корпусе універсітэта адбыліся лёгкаатлетычныя спаборніцтвы па бегу на 30 метраў сярод спартсменаў буйнейшых ВНУ горада Мінска.

У спаборніцтвах удзельнічалі калектывы спартсменаў універсітэта, політэхнічнага інстытута, інстытута народнай гаспадаркі і лесатэхнічнага інстытута.

У залік ад нашага універсітэта і Беларускага політэхнічнага інстытута ўваходзілі 10 мужчын і 5 жанчын, а ад лесатэхнічнага інстытута і інстытута народнай гаспадаркі — 7 мужчын і 3 жанчыны.



М. ЛАЎРЫНОВІЧ



А. ПАЎЛЮЧЭНКА

Ужо з першых забегаў высветлілася лепшая фізічная і спецыяльная падрыхтоўка універсітэцкіх спартсменаў. Пераможцам сярод жанчын вышла М. Лаўрыновіч, студэнтка геолага-геаграфічнага факультэта, з вынікам 4,8 секунды. Ёю-ж быў устаноўлены рэкорд універсітэта ў бегу на 30 метраў у зачыненым памяшканні—4,6 секунды, які быў паказаны ў папярэднім забегу.

Вострая спартыўная барацьба разгарнулася сярод мужчын. Але і тут яскрава была бачна перавага універсітэцкіх спартсменаў. У поўфінальных забегах за выключэннем Труса—спартсмена політэхнічнага інстытута—удзельнікамі былі толькі спартсмены нашага універсітэта. У фінале барацьба разгарнулася паміж студэнтам гістфака А. Паўлючэнка і студэнтам юрыдычнага факультэта Л. Гулякевічам. Абодва закончылі дыстанцыю з выдатным вынікам—4,0 секунды. Пасля нарады судзейскай калегіі пераможцам быў прызнаны А. Паўлючэнка, які быў на грудзі уперадзе.

Спаборніцтвы паказалі, што работа ў лёгкаатлетычнай секцыі універсітэта (старшы трэнер В. Кушнароў) добра наладжана.

Цяпер нашы лёгкаатлеты рыхтуюцца да першынства ДСТ «Навука» г. Мінска і да зімовага першынства ДСТ «Навука» Совецкага Саюза, якое адбудзецца ў Ленінградзе.

**І. ДАБРАЛЮБАЎ.**

## СТРАЛКОВЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ

Ва універсітэце прайшлі міжфакультэцкія стралковыя спаборніцтвы трэцяй круглагадавой спартакіяды. У спаборніцтвах прыняло ўдзел 8 факультэцкіх каманд. У першыя тры дні змагаліся каманды біёлага-глебавага факультэта, хімічнага, гістарычнага і філалагічнага факультэтаў.

У выніку спаборніцтваў лідэрам аказалася каманда хімічнага факультэта, у якой у сярэднім на ўдзельніка прышлося 256,6 ачка. Усяго толькі на 0.3 ачка на ўдзельніка адстала каманда біёлага-глебавага факультэта.

Услед за імі ў барацьбу ўступілі каманды юрыдычнага, геолага-геаграфічнага і фізіка-матэматычнага факультэтаў. Добра падрыхтаваная каманда геолага-геаграфічнага факультэта закончыла стральбу з выдатным вынікам і заваявала першае месца. Сярэдні вынік каманды—273,44 ачкі з 300 магчымых на кожнага ўдзельніка. На другое месца вышла каманда фізіка-матэматычнага факультэта з вынікам 258,08 ачкоў; трэцяе месца заваявала каманда хімічнага факультэта. Наступныя месцы занялі каманды біёлага-глебавага факультэта, аддзялення журналістыкі. гістарычнага і філалагічнага факультэтаў. Непадрыхтаванай прышла да спаборніцтваў каманда такога вялікага факультэта, як юрыдычны, якая заняла апошняе месца з сярэднім вынікам у 211, 16 ачка.

Вельмі настойлівай была барацьба за асабістае першынство. Да канца спаборніцтваў тры ўдзельнікі—В. Пасюкевіч, І. Загорская і Л. Кабановіч—прышла з аднолькавым вынікам у 231 ачко з 300 магчымых. Па адзінагалоснаму рашэнню судзейскай калегіі пераможцам быў прызнаны студэнт IV курса геолага-геаграфічнага факультэта В. Пасюкевіч.

Добрых вынікаў дасягнулі студэнты геолага-геаграфічнага факультэта Б. Брэйва, Л. Генералава, Л. Дубяга, Ю. Маркава, Е. Нікіцін, студэнты фзімата В. Іваноў, І. Котава і студэнтка аддзялення журналістыкі Маскаленка.

Трэба адзначыць чоткую работу судзейскай калегіі (галоўны суддзя спаборніцтваў Л. Лыкін).

**Л. КАБАНОВІЧ**, намеснік галоўнага суддзі спаборніцтваў,
**М. МАЦЮТА**, суддзя.

◆ ◆ ◆

# ДЫСПУТ ПА ТВОРУ І. ЭРЭНБУРГА „АДЛІГА“

Шумна было ў пяцьдзесят восьмай аўдыторыі біялагічнага корпуса. На дыспут па кнізе І. Эрэнбурга «Адліга» сабраліся студэнты амаль з усіх факультэтаў.

Вядома, што гэтая кніга выклікала сярод чытачоў шматлікія меркаванні, спрэчкі. Летам гэтага года на старонках «Літаратурнай газеты» са сваім артыкулам аб аповесці «Адліга» выступіў К. Сіманаў. Прайшло зусім нямнога часу, і на старонках гэтай-жа газеты з'явіўся артыкул І. Эрэнбурга ў адказ на выступленне К. Сіманава. Некалькі раз змяшчала «Літаратурная газета» і водгукі чытачоў аб кнізе.

Усё гэта зусім натуральна, таму што аўтар у сваім творы паставіў многія пытанні жыцця совецкіх людзей: тут і адносіны іх да мастацтва, тут і іх асабістыя ўзаемаадносіны і іншыя. Толькі па-рознаму і не так, як у сваіх ранейшых творах, паказаў І. Эрэнбург розныя бакі нашага жыцця. А совецкі чытач, актыўны ўдзельнік гэтага жыцця, вельмі патрабавальны да пісьменнікаў, да іх твораў.

Вось чаму сярод студэнтаў нашага універсітэта дыспут па кнізе І. Эрэнбурга выклікаў вялікую цікавасць.

Ва ўступным слове аспірант кафедры зарубежнай літаратуры Б. Міцкевіч гаварыў аб вялікай ролі совецкай літаратуры ў выхаванні ў моладзі маральных якасцей совецкага чалавека.

— У нашай літаратуры створан поўнацэнны вобраз чалавека—чалавека-працаўніка. Вобраз чалавека соцыялістычнай эпохі служыць прыкладам у нашай барацьбе за комунізм, вучыць нас пераадольваць любыя цяжкасці. Але не такое-ж ураджанне пакідаюць у нас Пухаў, Танечка, Сабураў і іншыя вобразы з аповесці «Адліга». Гэта нікчэмныя людзі.

Многа гаварыў аб аповесці студэнт IV курса аддзялення журналістыкі Мальдзіс. Ён сказаў, што можна гаварыць толькі аб мастацкіх недахопах твора, але не аб яго ідэйнай заганнасці.

У сваім выступленні студэнтка III курса гістарычнага факультэта Хуцкая сказала, што яна не згаджаецца з К. Сіманавым, які выступіў супроць аповесці І. Эрэнбурга.

— Валодзя Пухаў—удалы вобраз аповесці,—гаворыць яна,—у нашым жыцці могуць яшчэ нараджацца Пухавы.

Тое-ж самае аб гэтым вобразе заўважыў і студэнт V курса аддзялення журналістыкі В. Тарас.

— Аўтар ўзнімае многа пытанняў, але ні на адно з іх не дае адказу,—адзначыў студэнт III курса біёлага-глебавага факультэта Ежынскі.—Аповесць «Адліга»—самы няўдалы твор у пісьменніка. Залішне многа ўвагі аўтар адводзіць недахопам совецкага грамадства.

Таму, як паказаны ў аповесці ўзаемаадносіны герояў, прысвяціў сваё выступленне Раецкі. Аб адмоўных баках кнігі гаварылі студэнты Ганчарэнка, Гапоненка, Іўченкаў і другія.

Выступіўшая ў канцы дыспута выкладчыца Н. Багалюбава адзначыла вялікае значэнне для студэнтаў гэтага дыспуту і падвяла яго вынікі.

**І. ШУЦІК,**
**студэнт першага курса аддзялення журналістыкі.**

# Метад калгаснага вучонага Т. С. Мальцава

**У рэдакцыю газеты «За сталінскія кадры» паступіў рад пісьмаў студэнтаў, у якіх яны просяць расказаць аб сістэме земляробства, распрацаванай Т. С. Мальцавым.**

**Выконваючы пажаданне чытачоў, рэдакцыя друкуе сёння артыкул дацэнта біёлага-глебавага факультэта нашага універсітэта С. Калішэвіча, у якім ён расказвае аб гэтым метадзе.**

Рашэнні лютаўска-сакавіцкага Пленума ЦК КПСС зрабілі велізарны ўплыў на далейшае развіццё сельскагаспадарчай навукі. У гэтых рашэннях наша партыя заклікае весці барацьбу супроць дагматызма і схаластыкі ў навуцы, супроць манаполіі асобных груп вучоных, ігнаруючых свежыя навуковыя сілы. Партыя патрабуе развіцця сельскагаспадарчай навукі на аснове калектыўнай творчасці вучоных і шырокага абагульнення перадавога вопыту калгасаў і соўгасаў, на аснове творчага супрацоўніцтва навукі і практыкі.

Цэнтральны Камітэт нашай партыі ўказаў, у прыватнасці, на непрадуманае і шаблоннае прымяненне травапольнай сістэмы земляробства, якое праводзілася ў радзе раёнаў краіны без уліку мясцовых асаблівасцей і ўмоў.

Заснавальнік травапольнай сістэмы земляробства В. Р. Вільямс, праводзячы вывучэнне пладароддзя глебы галоўным чынам ва ўмовах сярэдняй паласы еўрапейскай часткі нашай краіны, прышоў да вываду аб вядучай ролі ў структураўтварэнні глебы шматгадовых бабовых і злакавых траў. Свае вывады В. Р. Вільямс абагульніў у выглядзе травапольнай сістэмы земляробства, якая мае вялікае значэнне для пэўных зон.

Аднак многія паслядоўнікі В. Р. Вільямса ўзвялі яго вучэнне ў догму, дапускалі сур'ёзныя памылкі, лічачы травапольную сістэму земляробства прыгодным сродкам для ўздыму ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур на ўсёй тэрыторыі Савецкага Саюза. Дагматычнае прымяненне палажэнняў аб травапольнай сістэме земляробства прывяло ў некаторых раёнах да вялікага скарачэння пасеваў зернавых культур за кошт пашырэння плошчаў пад шматгадовымі травамі, ураджайнасць якіх аказвалася нярэдка крайне нізкай.

Справядліва крытыкуючы шаблоннае прымяненне палажэнняў травапольнай сістэмы без уліку асаблівасцей канкрэтных раёнаў і гаспадарак, партыя разам з тым папярэджвае ад агульнага ахайвання яе. Травапольную сістэму земляробства неабходна і важна прымяняць у такіх раёнах, як, напрыклад, нечарназёмная зона краіны і наогул у тых месцах, дзе шматгадовыя травы даюць высокія ўраджаі.

Прыкладам смелых творчых шуканняў у навуцы і практыцы служыць сістэма земляробства, распрацаваная ў адпаведнасці з мясцовымі ўмовамі паляводам калгаса «Запаветы Леніна», Шадрынскага раёна, Курганскай вобласці, лаўрэатам Сталінскай прэміі Т. С. Мальцавым.

Калгасны вучоны засноўвае сваю сістэму на наступных прынцыпах. Згодна з палажэннем аб травапольнай сістэме земляробства шматгадовыя травы ўзбагачаюць глебу арганічнымі рэчывамі, садзейнічаюць стварэнню структуры глебы, а аднагадовыя разбураюць яе. Гэта тлумачыцца тым, што аднагадовыя расліны адміраюць летам, на адносна сухой глебе, і іх корні перагніваюць у аэробных умовах і хутка мінералізуюцца. Пагэтаму глебы не ўзбагачаюцца арганічнымі рэчывамі. Шматгадовыя-ж расліны адміраюць позна восенню, ва ўмовах больш вільготнай глебы (у анаэробных умовах), што вядзе да накаплівання перагною.

Метад, распрацаваны калгасным вучоным Т. С. Мальцавым, зыходзіць з таго, што і шматгадовыя, і аднагадовыя расліны ў аднолькавай меры ўзбагачаюць глебу арганічнымі рэчывамі. Уся справа ў тым, што штогадовае пераворванне глебы з пераварочваннем пласта рэзка змяняе ўмовы жыцця ў глебе мікраарганізмаў, узмацняе аэробныя працэсы і садзейнічае тым самым разбурэнню глебавай структуры. Такім чынам, разбурэнне глебавай структуры выклікаецца не самімі аднагадовымі раслінамі, а штогадовым узорваннем з пераварочваннем глебавага пласта.

Сістэма земляробства, распрацаваная Т. С. Мальцавым, дазваляе абыходзіцца ў севазвароце без пасеваў шматгадовых траў (там, дзе яны даюць нізкія ўраджаі) і замяніць іх больш ураджайнымі аднагадовымі травамі, значна пашырыць пасевы зернавых культур. Гэта мае вялікае гаспадарчае значэнне.

Т. С. Мальцавым распрацавана новая сістэма апрацоўкі глебы, асноўнай мэтай якой з'яўляецца стварэнне моцнага глебавага пласта з добра складзенай трывалай камякаватай структурай.

Глеба ўзорваецца на глыбіню 40—50 см без пераварочвання пласта адзін раз на ўсю ратацыю 4—5-польнага севазвароту. Ворыва вытвараецца асобнымі плугамі без прадплужнікаў і адвалаў. Пры такім ворыве глебавыя пласты перамешваюцца нязначна і застаюцца ў асноўным на сваім месцы. Пасля гэтага вытвараюцца пасевы на працягу 3—4 год збожжавых і іншых аднагадовых культур па лушчонаму іржышчу без узорвання. Такая апрацоўка глебы можа даць вялікія ўраджаі і на землях з малаўрадлівым слоем, у тым ліку і на дзірвана-падзолістых.

Асабліва вялікае значэнне ў сістэме Т. С. Мальцава адводзіцца апрацоўцы папаравага поля перад пасевамі азімых культур. Яно ў пачатку чэрвеня глыбока рыхліцца безадвальнымі плугамі на глыбіню 40—50 см. Па меры паяўлення сарнякоў поле лушчыцца дыскавымі лушчыльнікамі і пасля дажджоў барануецца лёгкімі боранамі.

У наступную вясну поле барануецца зноў, пасля чаго праводзіцца сяўба вузкарадным або перакрыжаваным спосабам.

У далейшым, пасля азімых поле не ўзорваецца, а толькі апрацоўваецца дыскавымі культыватарамі, а затым, як з'явяцца пустазелле, культывацыю робяць зноў, але ўжо ў другім напрамку. У такім выглядзе поле застаецца на зіму, а вясной барануецца, дыскуецца і засяваецца.

На апрацаваных такім чынам палях Т. С. Мальцаў атрымоўвае ад 20 да 40 цэнтнераў пшаніцы з гектара.

Новая сістэма апрацоўкі глебы, прапанаваная Т. С. Мальцавым, мае вялікае значэнне ў захаванні і далейшым павышэнні ўрадлівасці глебы, што асабліва важна пры асваенні цалінных і абложных зямель.

Т. С. Мальцаў лічыць распрацоўку сваёй сістэмы яшчэ далёка незакончанай, і тое, чаго ён дасягнуў, неабходна, па яго думцы, праверыць у другіх раёнах нашай краіны, кліматычныя і глебавыя ўмовы якіх адрозны ад заходнесібірскіх. У прыватнасці, ва ўмовах Беларусі неабходна шырока праверыць метад Мальцава на нашых кіслых, дзірвана-падзолістых глебах.

Акадэмія навук БССР і кафедры глебазнаўства нашага універсітэта арганізуюць ужо з вясны 1955 года вопытную праверку метада Т. С. Мальцава ва ўмовах Беларускай ССР.

**С. КАЛІШЭВІЧ,**
**дацэнт.**

## *Палепшыць работу даследчых гурткоў*

Нягледзячы на тое, што навукова-даследчая работа студэнтаў у гуртках на біёлага-глебавым факультэце пастаўлена нядрэнна і факультэт займае па яе арганізацыі першае месца ва універсітэце, студэнцкае навуковае таварыства ў нас па сутнасці мала прыкладае да гэтага намаганняў.

Як высветлілася на справаздачна-выбарчым сходзе СНТ, якое адбылося ў апошніх чыслах мінулага месяца, былы састаў Савета СНТ нават не ведаў, колькі членаў налічваюць навукова-даследчыя гурткі біёлага-глебавага факультэта.

Выступаючыя на справаздачным сходзе справядліва адзначылі, што Совет СНТ у лепшым выпадку быў рэгістратарам падзей у навуковым жыцці гурткоў і не аказваў ніякага садзеяння ў паляпшэнні іх работы.

Даўно вядома, што гурткі фізіялогіі (кіраўнік Г. С. Юньева) і мікрабіялогіі (кіраўнік А. А. Езубчык) працавалі і працягваюць працаваць горш, чым іншыя гурткі на факультэце. Тым не менш, ні Совет СНТ, ні кіраўнікі гурткоў не прынялі ніякіх мер да паляпшэння работы гэтых гурткоў.

Больш глыбока ўнікаць у навуковую дзейнасць гурткоў, актыўна дапамагаць ім у наладжванні поўнацэннай работы, арганізаваць паболыш цікавых лекцый і дакладаў па асноўных праблемах навукі, сустрэч з выдатнымі дзеячамі навукі, актыўна ўдзельнічаць у падрыхтоўцы і правядзенні аглядаў, канферэнцый, конкурсаў,—вось тыя асноўныя задачы, якія ўваходзяць у абавязак Совета СНТ. Пры цесным узаемадзеянні з камсамольскай, прафсаюзнай і іншымі грамадскімі арганізацыямі ўноў абраны камітэт СНТ павінен ліквідаваць недахопы і ўзняць навуковую работу студэнтаў на біёлага-глебавым факультэце на больш высокі ўзровень.

**Б. ЧЭЧУГА,**
**студэнт 5-га курса, старшыня Совета СНТ.**

## ЛЕКЦЫЯ АБ МІЖНАРОДНЫМ СТАНОВІШЧЫ

Нядаўна ў чытальнай зале універсітэта загадчыкам лектарскай групы пры ЦК КПБ тав. Ступнікавым была прачытана лекцыя аб міжнародным становішчы.

Лекцыя была праслухана з выключнай цікавасцю. У канцы лекцыі тав. Ступнікаў адказаў на шматлікія пытанні выкладчыкаў і студэнтаў.

## Чэмпіёны ДСТ „Навука" па шахматах

Закончыліся спаборніцтвы на першынство Белсовета ДСТ «Навука» па шахматах. У спаборніцтвах прынялі ўдзел мацнейшыя шахматысты таварыства.

У выніку ўпартай барацьбы I-ае месца заваяваў універсітэцкі спартсмен студэнт V курса фізіка-матэматычнага факультэта кандыдат у майстры А. Ройзман. На другое месца вышаў студэнт II курса гэтага-ж факультэта першаразраднік З. Ліўшыц.

## Моладзь краін народнай дэмакратыі ў барацьбе за соцыялізм

**По старонках часопісаў краін народнай дэмакратыі**

У той час, як у капіталістычных краінах Захаду ўсё мацней і мацней адчуваецца подых крызісу, расце галеча народных мас, у краінах народнай дэмакратыі з кожным днём павышаецца добрабыт працоўных, якія з кожным днём усё бліжэй і бліжэй падыходзяць да светлага соцыялістычнага жыцця. З забітых і прыгнечаных у мінулым, краіны дэмакратычнага лагеру ператвараюцца ў краіны з перадавой культурай, магутнай прамысловасцю і сельскай гаспадаркай.

Актыўна ўдзельнічае ў барацьбе за пабудову соцыялізма моладзь народна-дэмакратычных краін. Арганізацыі моладзі з'яўляюцца тут бліжэйшымі памочнікамі комуністычных і рабочых партый. Малады чалавек у народна-дэмакратычных краінах акружаны ўвагай і клопатамі. Ён мае права ісці вучыцца ў любую ВНУ, школу або працаваць на заводзе ці ў сельскай гаспадарцы.

Пленумы ЦК комуністычных і рабочых партый, якія абдыліся ў мінулым годзе, прынялі рашэнні аб неабходнасці павышэння выпуска тавараў народнага ўжытку і аб ўздыме сельскай гаспадаркі. Моладзь горача адгукнулася на гэтыя рашэнні і прыняла самы актыўны ўдзел у іх ажыццяўленні. Так, у ГДР з кожным днём шырыцца масавы рух пад лозунгам: «Рабочыя—у вёску!»—Гэты рух мае мэтай накіраваць былых сельскіх рабочых, майстроў, тэхнікаў, інжынераў, працуючых зараз на фабрыках і заводах, на часовую або сталую работу ў сельскай гаспадарцы. Тысячы маладых немцаў, адгукнуўшыся на гэты заклік, ужо прапанавалі свае паслугі вытворчым кааператывам і народным маёнткам.

У падрыхтоўцы спецыялістаў сельскай гаспадаркі вялікую ролю ў ГДР адыгрываюць працоўныя калоніі, дзе вучацца і працуюць юнакі і дзяўчаты. Гэтыя калоніі, якіх у ГДР каля 30, агорнуты ўсебаковымі клопатамі ўрада.

У Польскай Народнай рэспубліцы на працягу 1954-55 гадоў будзе асвоена каля 800 тысяч гектараў абложных зямель. Першымі добраахвотнікамі, якія паехалі на асваенне новых зямель, былі юнакі і дзяўчаты. Тысячы прадстаўнікоў польскай моладзі выехалі ўжо на новыя землі ў Ольштынскае, Беластоцкае і іншыя ваяводствы краіны. У дапамогу маладым патрыётам дзяржава накіравала шматлікую тэхніку. Маладыя палякі таксама актыўна ўдзельнічаюць у будаўніцтве першых соцыялістычных гарадоў Польшы—Сталінгруда, Новай Гуты і іншых.

Юнакі і дзяўчаты Чэхаславакіі сталі першымі праваднікамі рашэнняў Х з'езда КПЧ, на якім асаблівая ўвага была ўдзелена сельскай гаспадарцы. Закончыўшыя васьмігадовую школу актыўна ідуць у сельскагаспадарчыя вучылішчы, дзе вывучаюць пладаводства, гародніцтва, біялогію і іншыя дысцыпліны.

Вялікая цяга ў моладзі Чэхаславакіі да вывучэння рускай мовы. З ахвотай яе вывучаюць тысячы юнакоў і дзяўчат у школах і навучальных установах краіны.

Недалёка ад горада Ліпно на рацэ Влатаве будуецца Шумаўскае мора. Першымі будаўнікамі, якія прышлі сюды, былі прадстаўнікі чэхаславацкай моладзі.

Маладыя балгары з'яўляюцца першымі будаўнікамі соцыялістычнага горада Балгарыі Дзімітраўграда.

На будаўніцтве шашы Цінхай—Тыбет у Кітаі маладзёжныя брыгады ў два разы перавыконваюць нормы выпрацоўкі. Адначасова яны займаюцца ліквідацыяй непісьменнасці сярод будаўнікоў. Раней насельніцтва Кітая, якое складае адну чвэрць насельніцтва зямнога шара, было амаль непісьменным. Пагэтаму адной з задач, якія стаяць перад КНР, з'яўляецца ліквідацыя непісьменнасці. Актыўны ўдзел прыняла ў гэтым мерапрыемстве моладзь Кітая. Толькі што вывучыўшы першыя іерогліфы, яна ўжо пачынае знаёміць з імі старэйшыя пакаленні, якія не мелі магчымасці вучыцца раней.

На фабрыках і заводах, у сельскагаспадарчых кааператывах і дзяржгаспадарках можна сустрэць маладых герояў працы. Усе яны поўныя рашучасці змагацца за новае светлае жыццё.

Удзельнічаючы ў будаўніцтве новага жыцця, моладзь краін народнай дэмакратыі бярэ прыклад са сваіх совецкіх сяброў. Яна дэталёва вывучае вопыт будаўнікоў Комсамольска-на-Амуры, Магнітагорска, Днепрагэса, Волга-Дона, Каховскай, Куйбышэўскай і Сталінградскай ГЭС. Сотні маладых палякаў, венграў, албанцаў, чэхаў, балгараў, кітайцаў, карэйцаў вучацца ў ВНУ Масквы і сталіц саюзных рэспублік. Пасля заканчэння інстытутаў, універсітэтаў яны праходзяць практыку на нашых заводах і фабрыках, авалодваючы ўсім лепшым, каб правесці гэтае лепшае ў жыццё ў сябе на радзіме. Так, напрыклад, у Румыніі на заводзе імя 23 жніўня працуе многа моладзі, якая вучылася ў СССР. Маладыя людзі прывезлі з сабой багатыя веды і робяць вялікі ўклад у творчую работу завода.

**Рэдактар В. Л. ШАЦІЛА.**

АТ 10652 Мінск, друкарня Выдавецтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна. Заказ 800